# За Беларусь!

## Дзяржаўныя святы землякі адзначаюць як сямейныя, асабістыя. І гэта добры знак

Ліпень парадаваў ад самага пачатку. Месяц распачаўся трыма выхаднымі днямі, да таго ж адзін з іх не проста вольны ад працы, а дзяржаўнае свята. Бадай, самае галоўнае і вызначальнае для нашай суверэннай краіны – Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі). Яго прыгожа і годна адзначаюць паўсюль, але з найбольшым размахам – у Мінску. Што цалкам зразумела, бо дзе яшчэ, як не ў галоўным горадзе дзяржавы, гэта свята набывае асабліва сімвалічны і нават сакральны сэнс.

Відаць, як і для большасці мінчан, дазволіць сабе раскошу бавіць спакусліва гарачыя летнія дзянькі на асфальце ніяк не выпадала, і мы выправіліся ў вёску – пагасцяваць у радні. Але папярэдне дамовіліся, што 3 ліпеня абавязкова вернемся ў Мінск як мага раней, каб палюбавацца на прыхарошаную сталіцу і самім яшчэ даць нырца ў непараўнальную атмасферу святочнага ліпеньскага вечара. Тады нават у думках не было, што гэта паездка стане ў нейкім сэнсе адкрыццём, можна сказаць, матэрыяльным сцверджаннем уласных думак і размоў.

Пачалося ўсё з сястры, якая, даведаўшыся на трэці, апошні, дзень нашага гасцявання пра намер выправіцца ў зваротную дарогу адразу пасля сняданку, забедавала. Маўляў, куды вас ні свет ні зара панясе: свята ўсё ж, трэба па-людску адзначыць і суседак ужо запрасіла. Ажно няёмка стала. Давялося шукаць кампраміс. Святочны збор прызначылі на паўтары гадзіны раней, і пад сястрынскае «раз вы такія, то схадзіце ў магазін» адправіліся па хлеб і мінералку.

Уначы прайшоў ладны дождж, і ўсё навакolле цяпер млела-песцілася ў ранішняй утульнай прахалодзе. Люблю гэту кароткую часіну – яшчэ бадзёрую, не прыгнечаную гарачынёй, калі вольна дыхаецца і лёгка думаецца. Хораша!

**3 ліпеня 2023 года. Беларусь святкуе Дзень Незалежнасці**






– Здароўце, – азірнуўшыся, на мясцовы манер гукае жанчына, якую наганяем ля будынка, дзе месцяцца адразу кантора, пошта і клуб. – Са святам!

Абдымаемся, віншуючы адно аднаго. Былая настаўніца мясцовай школы, пенсіянерка Святлана Сцяпанаўна таксама кіруе ў магазін.

– Зяць з дачкой, унукі неўзабаве прыязджаюць, – тлумачыць яна па дарозе сваю патрэбу наведаць гандлёвую кропку. – Кажу: мо не едзьце толькі на дзень. Усё ж 150 кіламетраў у адзін бок. Дык не, заўпарціліся: прыедзем, мама, павіншаваць цябе.

Жанчына дакорліва паківала галавой. Але яе вочы не падманваюць. Яны свецяцца радасцю і прадчуваннем жаданай і хуткай сустрэчы з роднымі людзьмі.

– Дзень нараджэння ў вас сёння?

– Можна і так сказаць. Дакладней, другі дзень нараджэння. Як і ва ўсіх беларусаў, – з усмешкаю гаворыць яна.

Вось што значыць настаўнік мовы і літаратуры, няхай сабе на пенсіі, – вобразнасці мыслення можна толькі пазайздросціць.

– Усё ж такі пачынаюць беларусы цаніць сваю краіну, – раптам робіць выснову Святлана Сцяпанаўна. – Раней не надта пра гэта задумваліся, успрымалі ўсё як належнае. А выйшла так, што зараз кожнаму трэба ўсвядоміць і не хавацца, як баязлівы заяц ці шкадлівы кот у бульбоўніку, за чужыя плечы: Радзіму трэба бараніць, клапаціцца пра яе. Як пра самае святое і дарагое, што ёсць у жыцці.

– Сцяпанаўна, гэта амаль тост за святочным сталом, – па-свойску падкалоў жанчыну мой пляменнік.

– Так і скажу дзецям, а што ты думаеш?! – жартаўліва тузае яна таго за плячо. – Хаця яны ў мяне разумныя і добра арыентуюцца, што да чаго. А келіх шампанскага за нашу Беларусь сёння – абавязкова!

Сустрэча ў Дзень Незалежнасці на вясковай вуліцы доўга не выходзіла з галавы. Сапраўды, разважаў я па дарозе ў сталіцу, мае рацыю гэта звычайная жанчына. Відаць, нам трэба было прайсці праз выпрабаванні, навучыцца жыць ва ўмовах інфармацыйных і санкцыйных войнаў, спазнаць здраду і ўбачыць прыклады высакароднасці і патрыятызму найвышэйшага гатунку, каб зразумець: не будзе ўжо «хата з краю» ці існавання «пад плінтусам». Стаўкі занадта высокія, а дакладней, невымерныя. Бо з чым, з якімі каштоўнасцямі свету суаднесці шчасце жыць і працаваць у роднай незалежнай і суверэннай краіне? Сваё шчымлівае адчуванне прыналежнасці да народа, слаўная гісторыя якога прарастае каранямі ў сівую даўніну? З чым параўнаць і супаставіць магчымасць радавацца кожнаму стваральнаму мірнаму дню, з энтузіязмам дбаць пра будучыню дзяцей і ўнукаў. І галоўнае – цвёрда ведаць і быць упэўненымі, што ў такой дзяржаве, як наша, агульнымі намаганнямі заўтрашні дзень будзе шчаслівым і светлым.

Усвядоміць розумам і адчуць сэрцам уласнае дачыненне да лёсу Радзімы – вялікая справа. Гэта і ёсць праява сапраўднага, дзейнага, а не трыбуннага ці напаказ патрыятызму. І нават тое, як беларусы святкавалі сёлета Дзень Незалежнасці, яшчэ раз пацвердзіла: усё ў нашай краіне будзе добра, разам мы пераадолеем любыя нягоды. Не прывыкаць, як кажуць.

Па дарозе дадому адмыслова зварочвалі з трасы, каб пабываць у райцэнтрах і паглядзець, што там і як у святочны дзень. Заехалі ажно ў тры. І ўсюды кінулася ў вочы характэрная асаблівасць: людзі выйшлі на вуліцы, у паркі цэлымі сем'ямі, і тады часта можна было ўбачыць прадстаўнікоў адразу трох пакаленняў. Смех і радасць, на тварах шчырыя ўсмешкі. Любата!

Пасля такіх уражанняў, прызнацца, крыху насмяшылі выпадкова пачутыя нараканні, што не так шмат людзей было ўдзень на святкаванні Дня Незалежнасці ў Мінску. Адразу згадалася вёска, адкуль мы толькі вярнуліся і прывезлі з сабою непаўторны ўзнёсла-патрыятычны настрой і стаўленне да галоўнага дзяржаўнага свята як да асабістага, сямейнага – цёпла, з душою… І з радасцю выправіліся ў горад, да стэлы. Абняўшыся з незнаёмымі людзьмі, у стракатым святочным натоўпе спявалі галоўную песню роднай краіны, а пад россып каляровых вогненных промняў у начным ліпеньскім небе загадалі жаданне – каб жыла і квітнела родная Беларусь!

*Ігар ГАНЧАРУК*